# Прафесар з вёскі Бароньці

У гэтай вёсцы ў 1920 годзе нарадзіўся Мікалай Фядосавіч Лызікаў. Сын селяніна, у 1939 годзе ён закончыў Магілёўскую фельчарска - акушэрскую школу і быў накіраваны на работу. Але нядоўга давялося працаваць, бо неўзабаве Мікалай Фядосавіч прызываецца ў армію. Службу пачаў ваенфельчарам у стралковым палку.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны М. Ф. Лызікаў — у дзейнічаючай арміі. Аказваў медыцынскую дапамогу параненым. Ваяваў на многіх франтах — Ленінградскім, Волхаўскім, Першым Прыбалтыйскім і Трэцім Беларускім. Двойчы быў паранены.

Дэмабілізаваўшыся з радоў Савецкай Арміі, Мікалай Фядосавіч, які меў ордэн Айчыннай вайны другой ступені і медаль «За адвагу», паступіў у Віцебскі медыцынскі інстытут. Навукай пачаў займацца яшчэ на студэнцкай лаўцы. Адразу ж пасля заканчэння інстытута быў залічаны ардынатарам на кафедру акушэрства і гінекалогіі. Праз тры гады выбіраецца асістэнтам гэтай кафедры. Навукова - педагагічную работу Мікалай Фядосавіч сумяшчаў з арганізатарскай дзейнасцю, з'яўляючыся спачатку намеснікам, а потым загадчыкам аддзела аховы здароўя Віцебскага аблвыканкома.

У 1957 годзе ён быў выбраны дацэнтам кафедры акушэрства і гінекалогіі, а ў 1959 годзе на яго былі ўскладзены абавязкі загадчыка гэтай кафедры. Мікалай Фядосавіч абараніў доктарскую дысертацыю.

Сярод вучняў М. Ф. Лызікава 13 кандыдатаў медыцынскіх навук. Узначальваемая ім кафедра пастаянна аказвае вялікую практычную дапамогу лячэбна - прафілактычным установам. За сваю працоўную дзейнасць ён узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём «За доблесную працу».

**В. БРЖЭСКІ,**
прафесар, доктар медыцынскіх навук.